*Таццяна Ганчарова-Цынкевіч*
*(Мінск)*

# МАКСІМ ГАРЭЦКІ – ПЕЙЗАЖЫСТ

Прыродная вобразнасць мастацкага свету Максіма Гарэцкага напоўнена адчуваннем жыцця і светлым багаццем фарбаў, сагрэта яркімі пералівамі пейзажных замалёвак. Пісьменнік ведае кошт мастацкага краявіду, умее яго маляваць.

Майстэрства пейзажу М. Гарэцкага ярка праявілася ў аповесцях “Меланхолія” і “Ціхая плынь”. Названыя творы змяшчаюць у сабе найпрыгажэйшыя пейзажныя краявіды Беларусі. Прыродныя вобразы жывуць ва ўспамінах галоўных герояў гэтых аповесцяў, атаясамліваюцца з нясталасцю і зменлівасцю жыцця, дапамагаюць стварыць адпаведны настрой і напоўніць атмасферу мастацкай рэчаіснасці шчырай радасцю, рознакаляровым святлом пачуццяў. Так, у раздзеле “Млявыя сненні” аповесці “Ціхая плынь” аўтар эмацыянальна падае карціны розных пор года: “Жніво. Ранне”.

Спелае жыта схіліла каласы. Блішчыць раса і буйнымі круглымі слязьмі капае з коласа, і з тонкага залатога сцябелля. Тхне свежасцю зямелька...

Там-а-там сінеюць чароўна-прынадныя галоўкі-красачкі ціхіх васількоў. Трыпутнікам, гугалем і мышыным гарошкам парасла высокая мяжа.

Падзьме цёплы, і густы, і лёгкі ветрык - і ад жытняе сцяны льецца і плыве пах упрэлай палявой зямлі і ціхамірнай непрыкметнай румянкі, сыплюцца ў сем колераў вясёлкі росныя перлы, дыхаюць ўгору духам цеплыні.

Шырокая а далёкая жоўтая ніва!...

Шарпае пад лёгкімі лапцікамі колкае і яшчэ поўнае соку іржышча... Дзятліна зелянее патройнымі лісцінкамі. Клякоча скакунец-каваль. Гудам гудзіць сіне-пазалачваная муха. Трапыхаецца і снуе туды-сюды над жытам жоўценькая мятлушка...

А нечыя жнеі прыйшлі ўжо... Узоймецца галава ў белай намётцы... Схавалася белая намётка... узмятнуласячырвоная хустачка дзяўчыны...” [1, с. 291-292]. Каляровая гама пейзажу кранае сваім лірызмам, захапленнем радасці ад судакранання да прыроды, паэзіяй сентыментальнай летуценнасці. Мастак слова праз колерную насычанасць стварае чароўныя і запамінальныя вобразы жніва. Святлацені і фарбы акрэсліваюць зрокавыя карціны і фарміруюць эмацыянальны настрой. М. Гарэцкі чуйны да жыцця прыроды, яго пейзажы вылучаюцца дакладнасцю дэталяў і эстэтычнай арыентаванасцю на багаты ўнутраны свет лірычнага героя. Колеры вясёлкі, як кажа сам пісьменнік, прысутнічаюць у вышэйпрыведзеным урыўку: жоўты і золата - фарбы надыходзячай восені (спелых каласоў, згасаючай лістоты, ураджайнай зямлі); сіні - сімвал прасторы і глыбіні, бяздоння, што звязана з марамі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мроямі галоўнага героя; зялёны пануе ў прыродзе - самы загадкавы і містычны, які суправаджае стан пераходу ад рэальнага свету да свету невядомага, духоўнага; белы - сімвал жыцця, які разам з чырвоным азначае чысціню, здароўе, духоўную свабоду і прыгажосць.

Сыход лета, прадвосеньская пара - любімыя паэтычныя матывы М. Гарэцкага: “Гэты дзед - паэт у душы і вельмі ўлюбіў пару года між лета і восені, калі надыходзіць пярэкрут у прыродзе на зіму, калі ўсё расліннае даспявае, сыпле семя, дбаючы аб сваім жыцці ў патомстве... Любіць дзед ісці аб гэтай пары па сцежачцы сярод зялёнай пушчы канапелек, якія тхнуць сваім п’яным пахам і патроху прадзіраюць вочкі. Любіць любавацца на фарботы залаценькай павуціны, што бліскаюць на сонцы, цягнуцца, быццам плывуць і быццам сцелюцца ад поля (дзе пажата і пусцее), на гароды (дзе густа і поўна, а ўжо смягне і ўсыхае) і дальш на чорныя гоні (дзе незабавам зачырванее рунь). Любіць дзед, расклаўшы цяпло пад асеццю і паплакаўшы ад елкага, з пахам прэлай гуменнай зямлі, дыму, доўга-доўга сядзець і бавіць час ля палыхаючых агнём плашак і грэць старыя косці” [1, с. 265-266]. Радасны настрой дзеда выкліканы знаёмымі пахамі роднай зямлі, багатымі фарбамі ўраджаю. Гарэцкі-пейзажыст тут таксама не прамінае каляровых апісанняў прыроды, што стварае асаблівую атмасферу ўспрыняцця жыцця як нейкага цуда.

Пісьменнік жывапісуе словам: “Яшчэ яно быццам да вечару дужа далёка.

Ды неўзабаве кіне сонейка над лесам чырвоныя заходнія касулі, што з прыгожага, але трывожнага святла. Сплывуцца светленькія болачкі ў бліскуча-хмарныя з краёў грудкі і вялікія сярэбраныя кучы. Асвеціцца закат ціхім, супакойным, роўным полымем - і лягуць прахалодлівыя сцені. Звалчэ троху на дарогах пыл...” [1, с. 301]. Праз пейзаж аўтар перадае ўспаміны героя дзіцячай пары, калі ярка запамінаюцца ўсе дробязі, усе захапленні маляўнічым і таемна-невядомым адкрыццём светаіснавання. М. Гарэцкі валодае ўменнем маляваць уражанні словамі, адчуваць паэзію хараства ў прыродзе. Мастак улюбёны ў краявіды роднага краю, таму з лёгкасцю напаўняе карціны прыроды непаўторным адчуваннем гармоніі жыцця, звонкай радасцю ад судакранання да хвалюючых і чароўных багаццяў Беларусі.

Сярод пісьменнікаў шмат прыхільнікаў сініх фарбаў. Гэта самы лірычны колер, у іх творцы знаходзяць прастор і глыбіню, таямнічасць і супакой, вызваленне ад зямной мітусні. Так, у пейзажах пісьменніка шмат сіняга і блакітнага: “У цяньку, пад павеццю, ля дрывотні, яшчэ не растаў халадок ліпнёвага рання. Але ўверсе, над пуняю, ля самага вільчыку, ужо ліецца-пераліваецца жывое срэбра з нагрэтага паветра, дакляруючы кірмашоўцам гарачы дзень на кірмашы ў Лугвеневе. Дрыжыць яно і мітусіцца і ўжо патроху знікае з воч, і ўжо няма... скрозь - сіняе, блакітнае, бы лёнаў цвет, вялікае цёплае неба” [1, с. 302]. Сіні і блакітны ў Гарэцкага яркі і бяздонны, звязаны з марамі і надзеямі будучыні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Нельга сабе ўявіць творчасць М. Гарэцкага без вясковых пейзажаў, якія пазначаны цішшу і застыласцю ў паветры: “Ціха вясковая вуліца. Паснулі сланечнікі і макі. Аніводным пазалочаным лістком не варухнуць яблынькі ці сліўкі. У галлі і лісці бялеюць і чырванеюць яблыкі, а паспелыя сліўкі густа спляліся і віснуць, чорныя да долу” [1, с. 267].

Паэзія беларускай вёскі пазначана адчуваннем цяпла, залітага сонечным светам - цалкам прыродным колерам, колерам расліннага свету, які атаясамліваецца з міфапаэтычнымі ўяўленнямі старажытных славян з самім жыццём, з працягам роду. Пісьменнік у колеравобразным апісанні навакольнага асяроддзя не карыстаецца прамым указаннем на ўжыванне жоўтай фарбы, ён карыстаецца больш асацыятыўным планам апісанняў (сланечнікі, якія квітнеюць жоўтым; лісты (зелень) на дрэвах залітыя залатым светам, які падаецца ў жоўтым яго значэнні), што дае магчымасць аўтару пэўным чынам скарыстаць эмацыянальную афарбоўку і ўздзейнічаць на чытача зрокава і пачуццёва. М. Гарэцкі ведае, што розныя адценні жоўтага набываюць пэўную эмацыянальную афарбоўку: чыста жоўты можа выклікаць сумны настрой, залаты заўсёды азначае радасць, шчасце, багацце, чаго і хацелася дабіцца пейзажысту ў замалёўцы вясковай прыроды.

Як вядома, зялёны і жоўты знаходзяцца побач у колеравым коле: зялёны колер - сярэдні паміж жоўтым і блакітным. Само слова зялёны паходзіць ад кораня, што і слова жоўты. У народнай культуры старажытных славян зафіксаваны выпадкі ўспрымання “зялёнага колеру як “бліскучага”, які “ззяе”, падобны да жоўтага і залатога [4, с. 305]. Гэта мы і назіраем у вышэй прыведзеным урыўку. Таксама варта адзначыць, што зялёны і жоўты - цалкам прыродныя колеры. У асацыятыўным плане зялёны - колер расліннага свету, жоўты - колер сонца, восені. Змяшэнне абодвух колеракодаў дапамагае М. Гарэцкаму па-мастацку дэталізаваць апісанне надыходзячай восеньскай пары.

У вышэйзгаданым прыкладзе відавочны і рацыянальны падыход аўтара да колеравобразнага апісання навакольнага асяроддзя, сутнасць якога праяўляецца ў імкненні звязаць зялёны і жоўты з канкрэтнымі з’явамі прыроды.

Гарэцкі-пейзажыст малюе свежа і праўдзіва, яго свабоднае валоданне светлафарбамі не можа не захапляць: “Такая ж цёплая, чыстая раніца! На падворку, дзе сонейка цалуецца з залатою саломкаю, порскаюць парасяткі рабенькія і чарнюсенькія, бы жучкі, і пярэсценькія ды ржава-рудзенькія - усе з гладзенькайшэрстачкай, з маленькімі, дзяцінымі чысценькімі лычыкамі. Жартуюць, клычуць саломку” [1, с. 296]. Неад’мны атрыбут жыцця вёскі - жывёльны свет. Частка пейзажаў пісьменніка прысвечана апісанням кароў, авечак, парсюкоў, сабак, якія застаюцца ў эмацыянальнай памяці чытача.

У аповесці “Меланхолія” пейзажнае мысленне пісьменніка знаходзіць прыгажосць у адухаўленні прыроды: “Нарэшце, вось і лес...

Дарога пайшла вузенькім праходам між дрэў, над якім павісла густа сплеценае веццe. Супакой, ціша і прахаладзь панавалі тут.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Там-а-там па дарожцы траплялiся i лезлi пад ногi карэнне шматгадовых дрэў-волатаў. Косы сонца не прабiралiся скрозьператканае суччо бяроз або шырокiя лапы хвой, - i густы сцень ляжаў на дарозе. Гушчары ляшчыны, дробнага альшэўнiку, маладых асiнак i лазы пры канаве абступалi дарогу, i ўсё страшэнна парасло i сплялося.

Асаблiвае пачуццё выклiкалi спрадвечныя лесавыя асiлкi сваёй велiччу, гушчынёю, паўсядзённым цёмным холадам. Яны давiлi чалавека, шапталi яму аб яго адзiноце i слабасцi. Але яны ж давалi i супакой таму, хто ад зямлi i лесу ўзяты...” [1, с. 196]. Таямнiчае царства лесу зачароўвае магутным духам сваiх бароў i пушчаў, ад яго можна чакаць i добрага i злога. Часам чалавеку ў высозным цёмным лесе становiцца нязвыкла i няўтульна, аднак спрадвеку лес - абаронца, хоць i праяўляе часам свой нораў, але гэта толькi на нейкае iмгненне, якое знiкае ў вынiку далучэння героя да багаццяў прыроднай стыхii: “I Лявон заўважыў, што каля дарогi даволi часта сядзяць малiнавыя кусты з тонкiмi, пад колер сасны, былiнамi i з бялявымi падыспадам лiстамi. Ён сашчапнуў колькi малiнiн, пачуў у роце свежасць i салодкасць, i яму раптам зусiм праўдзiва здалося, што гэта ён у сваiм родным Цёмным Лесе, прыйшоў у малiну i радасна, без усякага клопату, здарова i вясёла, як у маленстве, ходзiць мiж дрэў, у халадку” [1, с. 197]. Пейзажная замалёўка лесу дапамагае М. Гарэцкаму зафiксаваць эмацыянальны i псiхалагiчны настрой героя, як правiла - гэта настрой нявызначанасцi, незразумелай трывогi, звязанай не толькi з жаданнем паказаць загадкавую, складаную прыроду чалавечай душы, але i з яго роздумамi пра лёс будучынi.

Своеасаблiвай уверцюрай да апавядання “Чарнiчка” з’яўляецца апiсанне сумнага восеньскага пейзажу, якi настройвае чытача на адпаведны лад успрымання павольнага жыцця чарнiчак: “I трэба было згадзiцца, што восень на двары, а нейкае невыразнае нездавальненне варушылася на сэрцы, i чагосьцi сярод восеньскага смутку жадалася” [2, с.138]. Карцiна навакольнага асяроддзя атаясамлiваецца з духоўным светаадчуваннем гераiнь твора, стан прыродыз’яўляецца модусам выпрабавання iх любовi да Бога. З першага сказа М. Гарэцкi звяртае ўвагу на неба i зямлю, тым самым настройвае чатача на нябеснае i зямное ў свеце: “Над пахмураю, мокраю зямлёю павiсла шэра-цёмнае, нуднае восеньскае неба.

Пустая вулiца маўчыць. Людзi, калi ў двары, дык сядзяць па хатах. I конi ў пунi, бо ў полi зямля замерзла, i толькi сёння троху адтала i пакрылася лiпкаю гразёю. А ў лагчынах яшчэ бялеецца, па лагу i блiзка лесу, рэдкi снегавы нылёт” [2, с. 137]. Сумны восеньскi дзень уплывае на ўнутраны стан людзей, якiя моцна адчуваюць сваю залежнасць ад надвор’я. Акцэнт на журботны пейзаж восенi дапамагае аўтару пазбегнуць спрошчанасцi ў паказе ўнутранага свету малiтоўнiц, дазваляе яму не навязываць свой погляд на мiрское i духоўнае жыццё.

У “Сiбiрскiх абразках” можна сустрэць дакладныя i ёмiстыя апiсаннi прыроды, якiя сведчаць пра назiральнасць М. Гарэцкага як майстра апавядання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Для прыкладу возьмем твор “Пад’езд” з падзагалоўкам “Раман у дарозе”. Герой-апавядальнік гарачым сонечным днём крочыць сібірскімі сцежкамі. Ён ужо добра стаміўся, назіраючы нязвыклы воку пейзаж: “Уздоўж усяе дарогі гарэлі, як агонь, нейкія буйныя жоўтыя краскі. Яны нагадвалі палявую гваздзіку, але яны былі такія пышныя, такія незвычайна яскравыя, што аж непрыемна і страшна рабілася ад іхняе буйнае дзікасці” [2, с. 324]. Пейзажная замалёўка ўдала падкрэслівае ўнутраны стан героя, якога не радуе чужая прырода.

У апавяданні “Кіслая крыніца” аўтар зноў малюе падобную карціну: “Вышэй на лузе - усё тыя самыя, буйныя, як мак, чырвона-жоўтыя званочкі, кутасамі” [2, с. 343]. Зрокавы пейзаж М. Гарэцкага запамінальны, дакладны, дэталёвы, што яшчэ больш падкрэслівае канкрэтнасць і рэальнасць адбываючыхся падзей. Пісьменнік умела карыстаецца тонкім жывапісам, словам-фарбаю як сродкам эмацыянальнага настрою.

У літаратуразнаўстве, на жаль, мала даследавана творчасць Гарэцкага-пейзажыста, які валодае незвычайным талентам чуйнасці да прыгожага, умела карыстаецца каларытнымі мастацкімі дэталямі, напоўненымі непаўторным святлом і фарбамі жывапісу.

**Літаратура**

1. Гарэцкі, М. Творы: Апавяданні, аповесці / М. Гарэцкі. – Мінск: Мастац. літ., 1995. – 446 с.

2. Гарэцкі, М. Збор твораў у 4-х т. Т.1: Апавяданні / М. Гарэцкі. – Мінск: Мастац. літ., 1984. – 446 с.

3. Миронова, Л. Н. Учение о цвете / Л.Н Миронова. – Минск: Высш. школа, 1993. – 463 с.

4. Славянские древности: Этнолингвистический словарь в 5-ти томах / под ред. Н. И. Толстого. – Т.2: Д–К. – Москва: Международные отношения, 1999. – 704 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Любоў Глазман***
*(Віцебск)*

## ПРАБЛЕМА ПЕРААДОЛЕННЯ АСОБАСНАГА КРЫЗІСУ Ў “МАЛОЙ” ПРОЗЕ М. ГАРЭЦКАГА

У творчасці Максіма Гарэцкага асаблівая ўвага надаецца асобе, яе ўнутраным станам, самаўсведамленню. З аднаго боку, назіраем у яго творах характэрныя для беларускай літаратуры пачатку мінулага стагоддзя ідэйна-мастацкія з’явы: асэнсаванне сацыяльных праблем (узаемаадносіны інтэлігента і вяскоўцаў, трагічныя ваенныя падзеі, прыстасаванне да ўладаў ва ўмовах палітычных змен, інш.), пошукі нацыянальнай ідэнтычнасці